ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (1031) ● ЧАЦВЕР, 22 лістапада 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



Лабараторыя малых вылічальных машын. Студэнткі IV курса дзевятай групы на занятках па метадах практычнага вылічэння.

Фота С. БЕРАСЦЕНЬ.

## ЛЕНІНСКІ ЎРОК

**Усе камсамольскія арганізацыі універсітэта рыхтуюцца да правядзення Ленінскага ўрока «Вучыцца, працаваць і змагацца па Леніну!», прысвечанага 50-годдзю з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.**

**Бюро камітэта камсамола прыняло пастанову: правесці Ленінскі ўрок з 25 па 30 лістапада.**

**У плане ўрока гутаркі і семінары па гісторыі КПСС і ВЛКСМ, сучаснаму маладзёжнаму руху, знешнепалітычнай дзейнасці нашай партыі па рэалізацыі Праграмы міру.**

**Кожная група, курс атрымліваюць практычныя заданні: арганізаваць сустрэчу з камсамольцамі ленінскага прызыву, старымі камуністамі, афарміць выстаўкі, правесці вечары і гутаркі.**

**Створаны камісіі па падрыхтоўцы і правядзенню Ленінскага ўрока. Яны зацверджаны на пасяджэннях камітэтаў камсамола факультэтаў.**

**ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА.**

## АКТЫЎ ВУЧЫЦЦА

Адбыўся двухдзённы семінар — вучоба камсамольскага актыву універсітэта. На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады загадчыка аддзела гаркома камсамола Н. А. Кушнеравай «Работу камсамольскіх арганізацый вну — на ўзровень сучасных патрабаванняў» і загадчыка аддзела Мінскага ГК ЛКСМБ М. Ф. Кірэева «Задачы далейшага арганізацыйна-палітычнага ўмацавання камсамольскіх арганізацый у святле пастановы XIV пленума Мінскага ГК КПБ «Аб мерах па паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва камсамолам». Аб правядзенні Ленінскага ўрока і яго значэнні расказала загадчык аддзела прапаганды і агітацыі абкома камсамола В. А. Матусевіч.

Гутарку «Асноўныя пытанні ўліку і статыстыкі ў камітэце камсамола» правяла загадчыца сектара ўліку АК ЛКСМБ Т. Федзяня. Потым дакладчыкі адказалі на пытанні ўдзельнікаў семінара.

На наступны дзень вучоба праходзіла па секцыях: ідэйна-палітычнага выхавання, арганізацыйна-палітычнага ўмацавання, культурна-масавай работы, інтэрнацыянальнай работы, спартыўнай і абаронна-масавай работы.

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

## З УСЁЙ СУР'ЁЗНАСЦЮ

У камітэт камсамола універсітэта прыйшла студэнтка V курса ФПМ Таццяна Казакова са скаргай: на факультэце ўсяму курсу не дазваляюць падпісвацца на газеты. Што гэта — жарт? Аказалася, не. Баючыся лішніх клопатаў, камітэт камсамола факультэта прыкладной матэматыкі сапраўды выключыў пяцікурснікаў са спісаў, пазбавіўшы іх права падпіскі ў арганізаваным парадку. Маўляў, ідзіце ў «Саюздрук» самі.

Гэты і іншыя не вельмі прыглядныя факты сталі тэмаї размовы на чарговым пасяджэнні бюро камітэта камсамола.

Аб ходзе падпіскі членам бюро далажыў намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце У. Сілін. Як высветлілася, толькі факультэт журналістыкі паспяхова закончыў падпіску да сёмага лістапада. На фізічным факультэце, дзе каля дзвюх тысяч камсамольцаў, падпісалася толькі больш тысячы, на ФПМ з 1300 — крыху больш 500. Не лепш абстаяць справы на хімічным і біялагічным факультэтах.

Што ж здарылася? Няўжо падпіска ідзе марудна таму, што некаторыя камсамольцы не разумеюць значэння газет у шэрагу іншых сродкаў масавай інфармацыі. Хутчэй за ўсё, разумеюць. І справа зусім у іншым. Камітэты камсамола многіх факультэтаў і адказныя за друк няўмела арганізоўваюць кампанію па падпісцы. Не прапагандуюць пэўныя выданні, не наладжваюць абмеркаванні цікавых артыкулаў. Ні на адным з факультэтаў не праведзена «газетная анкета», каб выявіць, што больш любяць і чытаюць студэнты. Таму і атрымліваецца, што камсамольцам прапаноўваюць толькі сухія лічбы: па разнарадцы нам патрэбна выпісаць... Дарэчы, аб разнарадцы. Бюро камітэта камсамола сапраўды давяло яе да факультэтаў. Але такая разнарадка — не самамэта, і ўведзена яна ўсяго толькі для кантролю. Ды і не з яе трэба было пачынаць.

Работа па падпісцы — таксама значны выхаваўчы момант у жыцці камсамольскіх арганізацый. І праводзіць яе трэба разумна і нават далікатна.

На пасяджэнні бюро адказны за падпіску на ФПМ А. Дунаеў доўга растлумачваў, што ён быў заняты асабістымі справамі, таму не займаўся падпіскай. А дзе ж былі члены камітэта камсамола, камсоргі груп? Чаму, нарэшце, не звярнуліся за дапамогай у партыйнае бюро факультэта? Ніхто не дапамог і адказнай за падпіску на хімічным факультэце Валі Корбан. Таму на хімфаку дагэтуль так і невядома, хто і на што падпісаўся.

Камітэт камсамола прыняў пастанову: закончыць падпіску на перыядычныя камсамольскія выданні да 25 лістапада. Спадзяемся, да яе аднясуцца з усёй сур'ёзнасцю ў факультэцкіх камсамольскіх арганізацыях.

**Л. ЛІДЗІНА.**

## МАЦНЕЕ ДРУЖБА

Больш як тры гады звязвае моцная дружба вучняў Ляхавіцкай васьмігадовай школы Брэсцкай вобласці з шэфамі — студэнтамі факультэта прыкладной матэматыкі.

А пачалося ўсё з першай сустрэчы-знаёмства. Пасябравалі адразу: разам складалі план будучай работы, спрачаліся па розных пытаннях. Раўнадушных не было. А затым шматлікія выезды агітбрыгад з канцэртамі ў Ляхавічы, дапамога ў падрыхтоўцы вечароў, збораў, арганізацыя дыскусій, афармленне альбомаў, стэндаў.

Вялікай падзеяй у жыцці Ляхавіцкай школы быў дзень, калі маленькая бібліятэка папоўнілася 600 экземплярамі кніг, сабраных і падораных студэнтамі.

«Дружба павінна прыносіць як мага больш карысці нашым малодшым сябрам» — дэвіз шэфскай работы факультэта. Тры гады — тэрмін не малы. За гэты час з'явіўся вопыт, пашырыліся сувязі. У кастрычніку мінулага года са студэнтаў першага курса быў сфарміраван педагагічны атрад, асноўная задача якога — выхаваўчая работа ў дзіцячых пакоях міліцыі. Студэнты з вялікім энтузіязмам узяліся за справу.

Зараз, калі за плячыма ўжо цэлы год работы, можна з упэўненасцю сказаць, што студэнты выдатна справіліся і з гэтай задачай.

Вынік — падзяка бацькоў, настаўнікаў і саміх падшэфных.

**С. БЯСПАЛАВА.**

## ЧЫМ ЖЫВУЦЬ ГРУПЫ

Набліжаецца адказны момант у рабоце ўсіх камсамольскіх арганізацый —заканчваецца першы этап Ленінскага заліку. На ФПМ праходзіць зараз тыдзень наведвання. Вынікі праверак заносяцца ў спецыяльную табліцу, што вісіць на відным месцы.

Вялікую ўвагу камітэт камсамола факультэта ўдзяляе правядзенню палітінфармацый у групах. Пасля кожнай палітінфармацыі студэнт, які яе рыхтаваў, трымае справаздачу ў камітэце камсамола. І тут ужо ведаюць, у якой групе справы абстаяць добра, а дзе патрэбна дапамога.

Спаборніцтва паміж групамі разгорнута па «матэматычнай формуле», якая складаецца больш чым са ста пунктаў. Вынікі падводзяцца з дапамогай вылічальнай машыны.

**Р. БРУЦКАЯ.**

Матэрыялы пра будні факультэта прыкладной матэматыкі чытайце на 2-й стар.



## ЛЕКТАР—ПРАФЕСАР З ІЕНЫ

У мінулую суботу пяцікурснікі гістфака цёпла развіталіся з прафесарам Іенскага універсітэта доктарам Д. Фрыке, які на працягу месяца чытаў спецкурс «Праблемы германскага рабочага руху ў канцы XIX—пачатку XX стагоддзяў».

І раней у студэнцкіх аўдыторыях БДУ выступалі з лекцыямі вучоныя з ГДР, Балгарыі, Польшчы і іншых краін, але ўпершыню замежны вучоны быў запрошан для чытання цэлага спецкурса.

Прафесар Д. Фрыке, вядомы гісторык, лаўрэат нацыянальнай прэміі ГДР, даўно падтрымлівае цесныя сувязі з гісторыкамі БДУ. Ён разам з рэктарам нашага універсітэта прафесарам У. М. Сікорскім быў рэдактарам сумеснага зборніка «Супраць буржуазнай і рэфармісцкай ідэалогіі», які ў мінулым годзе выйшаў у выдавецтве БДУ. Зараз на кафедры новай і навейшай гісторыі рыхтуецца новы зборнік — «Інтэрнацыянальныя традыцыі сумеснай барацьбы германскага рабочага класа і працоўных Савецкага Саюза». Аўтары яго — гісторыкі БДУ і Іенскага універсітэта.

У час знаходжання ў Мінску прафесар Д. Фрыке побач з лекцыйнай выконваў і рэдактарскую работу для зборніка.

У дзень апошняй лекцыі ад імя пяцікурснікаў Галіна Мурашкіна падзякавала прафесару за цікавыя лекцыі і ўручыла яму памятны падарунак і кветкі.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам Д. Фрыке выказаў задавальненне добрай арганізацыяй заняткаў, што дазволіла яму эфектыўна працаваць. Цёпла гаварыў пра студэнтаў, іх грунтоўную спецыяльную падрыхтоўку, зацікаўленасць, працавітасць. «Я б хацеў бачыць такімі ўсіх сваіх студэнтаў», — сказаў прафесар.

У час гэтага візіту вялікую работу як перакладчык выканаў ст. выкладчык кафедры старажытнага свету і сярэдніх вякоў В. А. Мельцар.

НА ЗДЫМКУ: прафесар Д. ФРЫКЕ сярод студэнтаў гістфака.

Фота **Д. Чаховіча.**

# ХІМІЯ, ХІМІЯ...

— А я раней хацела стаць журналісткай. Потым перадумала, і вось цяпер на хімічным факультэце. І ніколькі не шкадую. У нас вельмі цікава. — Валя на момант адарвалася ад сваіх прабірак.

...Я прысутнічаю на практычных занятках па аналітычнай хіміі ў студэнтак пятай групы II курса. Тэма заняткаў: «Чацвёртая і пятая групы катыёнаў». Валя Вештарт, адна з лепшых студэнтак, выдатніца, коратка тлумачыць мне, у чым сутнасць задання: патрэбна знайсці катыёны металаў чацвёртай і пятай груп у «задачах». «Задачамі» дзяўчаты называюць сумесі, якія дае кіраўнік Таісія Паўлаўна Бабаеўская. У іх прысутнічаюць усе катыёны элементаў чацвёртай і пятай груп. Шляхам складаных хімічных рэакцый і пераўтварэнняў патрэбна знайсці, якія з іх прысутнічаюць у дадзенай сумесі.

Дванаццаць дзяўчат у белых халатах засяроджана схіліліся над штатывамі. У маленькіх прабірках перад імі — «задачы». Якую рэакцыю трэба правесці спачатку, каб не памыліцца? Уважлівасць, уважлівасць і яшчэ раз уважлівасць. Нязначная памылка, недастатковая ачыстка раствору або няпоўнае асяданне вядуць да няправільнага рашэння.

У Лены Гарбацюк раствор блакітнага колеру, які можа даваць толькі медзь. Лене ўжо лягчэй. Але наперадзе мноства рэакцый.

На кожным стале ляжыць канспект, і раз-пораз дзяўчаты заглядваюць у яго.

— Для падстрахоўкі, — гаворыць Наташа Хадкевіч. — Такое мноства хімічных рэакцый. Тым больш, што яны вельмі падобныя. Памылка ж прымусіць амаль усё рабіць нанава.

Яна ўжо знайшла чатыры элементы і прынесла паказаць вынікі Таісіі Паўлаўне. Тая вымушана засмуціць дзяўчыну:

— Яшчэ два элементы табе знайсці.

— Ну вось, бачыш, — уздыхае Наташа, — цяпер усё спачатку...



А Люся Берняковіч аж свеціцца:

— Глядзі, Наташка, усё ж-такі атрымалася!

Дзве сяброўкі, Лена Гарбацюк і Таня Гарбацэвіч, абмяркоўваюць, як лепш правесці рэакцыю: у Лены нешта не атрымліваецца. Таісія Паўлаўна гаворыць мне па сакрэту:

— Гарбацюк я задала цяжэйшую задачу. Там ёсць вальфрам, яго нялёгка выявіць. Такія задачы я даю мацнейшым студэнткам. Не ведаю вось, ці знойдзе вальфрам Люда Бярэзіна: яна дзяўчына кемлівая, але крыху лянуецца.

Падыходжу да Люды, пытаюся, якія элементы яна ўжо знайшла.

— Свінец, ртуць, вальфрам...

Значыць, усё добра.

Валя Вештарт безупынна бегае ад цэнтрыфугі да свайго месца, ад штатыва да спіртоўкі, хвалюецца.

— Многа табе яшчэ засталося? — пытаюся.

— Ды ў мяне ўжо ўсё паадкрывалася, але...— і пабегла далей. Вось дык Валя!

Да канца заняткаў застаецца гадзіны паўтары. Са свайго месца ўстае Іра Аляксевіч і падыходзіць да стала. Таісія Паўлаўна з задавальненнем піша на лістку: «Правільна». Астатнія дзяўчаты даводзяць свае работы да канца.

Хутка ў блакноціку Таісіі Паўлаўны выстраяцца адзнакі: чатыры, пяць...

**Л. НІКУЛІНА.**

**НА ЗДЫМКУ: «чаруе» над прабіркамі Ала Сімукова.**

Фота **аўтара.**

# НОВЫ НАБОР РАБФАКА

У гэтым годзе на падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта будзе прынята 200 чалавек. Жадаючых жа вучыцца тут у чатыры разы больш. Таму прыёмнай камісіі прыйшлося правесці вялікую работу па адбору слухачоў. Ужо прайшлі гутаркі з будучымі гісторыкамі, філосафамі, эканамістамі, юрыстамі, журналістамі, філолагамі, фізікамі і матэматыкамі. Яны паказалі, што значна павысіліся ўзровень падрыхтоўкі юнакоў і дзяўчат, іх грамадская актыўнасць.

Першага снежня на рабфаку пачнуцца заняткі. Сярод тых, хто будзе займацца тут сёлета, дэмабілізаваныя воіны, рабочыя і калгаснікі. У іх ліку ўдарнікі камуністычнай працы, перадавікі вытворчасці, дэпутаты мясцовых Саветаў, былыя сакратары камсамольскіх і старшыні прафсаюзных арганізацый.

## «ВЫСТАЎКА УКРАІНСКАЙ КНІГІ»

—такі плакат і сцягі Украінскай, Беларускай рэспублік і Саюза ССР прыцягваюць увагу наведвальнікаў абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. Выстаўка размешчана ў прасторным пакоі. На паліцах творы класікаў марксізму-ленінізму, кнігі па ленінскай тэматыцы. Наведвальнікі асцярожна гартаюць прыгожую кнігу «Брацтва», дзе на палаючай чырванню супервокладцы выдзяляюцца яшчэ чырванейшыя літары—«СССР». Кніга адлюстроўвае ў фотаздымках мінулае і сучаснае і прысвячаецца 50-годдзю ўтварэння СССР.

Вельмі разнастайная тэматыка выданняў. Тут цікавыя кнігі для гісторыкаў, фізікаў, хімікаў. Многа дзіцячай літаратуры. Але найбольшае задавальненне, напэўна, атрымаюць тут філолагі. На выстаўцы прадстаўлены не толькі творы класікаў украінскай літаратуры—Т. Шаўчэнкі, Лесі Украінкі, І. Франка і іншых, але і пераклады на ўкраінскую мову рускіх і беларускіх пісьменнікаў. Прыемна было ўбачыць на паліцах кнігі Я. Коласа, М. Танка, І. Мележа і інш.

Прыцягваюць увагу выданні на некалькіх мовах, такія, напрыклад, як «Паклон табе, Славуціч», дзе тэкст дадзен на рускай, украінскай і беларускай мовах. Гэтае выданне вабіць не толькі прыгожым афармленнем, але і хараством вобразаў, паэтычнасцю думкі. «Сівы і адвечна малады Днянро вобразна называюць ракою яднання трох братніх народаў—украінскага, рускага і беларускага». Кніга і стала адлюстраваннем гэтага яднання. Тут змешчаны вершы Я. Купалы «Украінка», П. Броўкі «У Каневе», гогалеўскі «Цудоўны Дняпро пры ціхай пагодзе...» і г. д.

З'явіліся ўжо і першыя падзякі ў кнізе водгукаў. Гэта красамоўна сведчыць, што ўкраінскія кнігі падабаюцца беларускім чытачам.

**В. СТАРАСЦІНА, студэнтка.**

# ДА ЎСЯГО ЁСЦЬ СПРАВА

ВЫСОКІ чарнавалосы юнак задуменна схіліўся над аркушам паперы...

Адзін, другі штрых, і вось з-пад алоўка на лісце паперы паступова ўзнікаюць «героі» будучага нумара камсамольскага пражэктара...

— Як здарова! — пачуўся за спіной голас Уладзіміра Гулевіча, які разам з сакратаром камітэта камсамола юрыдычнага факультэта Мікалаем Корзунам з цікавасцю разглядае першапачатковыя накідкі карыкатур.

— Здаецца, карыкатура, а. бач ты, кожнага з нашых «герояў» і без подпісу можна пазнаць.

Мікалай павярнуўся на голас сябра:

— Ну што ты. Валодзя. Над гэтымі карыкатурамі яшчэ трэба папрацаваць, каб было, як кажаш ты, здорава...

І зноў схіліўся над аркушам: там паправіў нейкія штрыхі ў адной з карыкатур, там дабавіў штосьці да другой.

Гэтай настойлівасці ў працы над любым малюнкам Мікалай Бародка, студэнт юрыдычнага факультэта, навучыўся яшчэ ў Мінскім мастацкім вучылішчы. Гэта настойлівасць дапамагала Мікалаю і пры афармленні юрыдычнага факультэта, і пры выкананні многіх іншых грамадскіх даручэнняў.

На першы погляд Мікалай здаецца вельмі сур'ёзным і маўклівым, але гарэзлівыя агеньчыкі, якія раз-пораз з'яўляюцца ў яго светлых вачах, сведчаць аб тым, што іх гаспадар — чалавек вельмі вясёлы. Да гэтага бясспрэчнага вываду прыходзіў кожны, каму даводзілася сустракацца з ім.

Мікалай адразу ж зачароўвае субяседніка своеасаблівай манерай гаварыць. Ён заўсёды знойдзе час, каб паклапаціцца пра таварыша, у якога нешта «не клеіцца». Дасць параду, нечым дапаможа.

Нават здзіўляешся, як гэты юнак знаходзіць час, каб паспяхова спраўляцца з усімі грамадскімі даручэннямі. А іх у Мікалая... лічыце самі: начальнік штаба камсамольскага пражэктара, рэдактар газеты «Савецкі юрыст», член групы народнага кантролю, старшыня студсавета ў інтэрнаце № 4 і ў той жа час ён — добры студэнт.

А Мікалай на гэта толькі ўсміхаецца:

— Калі ведаеш, што трэба справіцца, то абавязкова для ўсяго знойдзеш час. Таварышы даверылі, і ты проста не маеш права не справіцца, інакш нельга...

Нядаўна ў яго жыцці адбылася падзея, якая запомніцца назаўсёды — Мікалай стаў членам КПСС. Амаль што адначасова з гэтай падзеяй, адбылася яшчэ адна — хлопец надзелен абавязкамі грамадскага памочніка пракурора Кастрычніцкага раёна горада Мінска.

Намнога прыбавілася ў яго спраў, але Мікалай заўсёды застаецца верным сабе.

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**





Свята студэнцкай салідарнасці — Міжнародны дзень студэнтаў—адзначана ва універсітэце шчырымі інтэрнацыянальнымі сустрэчамі, разнастайнымі канцэртамі на вечарах дружбы. А ўмацоўвае яе кожны дзень многанацыянальнай універсітэцкай сям'і, які насычан напружанай працай, цеплынёй і сардэчнасцю.

У студэнцкіх інтэрнатах і аўдыторыях, у час адпачынку, у турысцкіх падарожжах яны побач — беларусы, рускія, украінцы, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей і замежныя сябры, якія вучацца ў БДУ.



● **Урок скончыўся, але вывучэнне рускай мовы працягваецца. Акпола Джаэль Мокве і Абумерэ Філіп прыехалі вучыцца ў Беларусь з Федэратыўнай Рэспублікі Нігерыі.**

● **Уважліва слухаюць тлумачэнні выкладчыка фізікі Нгуен Цінь і Нгуен Май.**

● **Ля карты студэнтка IV курса геафака Таццяна Кірдзяшкіна.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# А ВЕДАЕМ МЫ ФІЗІКУ?

**ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ**

Прачытаў я артыкул Л. Перасыпкінай «Ці свеціць прыгажосць усім?» і задумаўся Сапраўды, гаварыць аб узнятых праблемах трэба, і вырашаць іх таксама патрэбна. Сучаснае жыццё патрабуе не толькі высокакваліфікаваных, але і высокакультурных спецыялістаў. І зусім правільнае сцвярджэнне, што «...акрамя ведаў у галіне пэўнай навукі, яму (спецыялісту) неабходна валодаць высокай культурай, быць інтэлігентам».

Але, чытаючы артыкул, няцяжка заўважыць аднабаковы падыход аўтара да гэтага пытання. Выходзіць, што толькі мастацкая літаратура, кіно павышаюць культуру, інтэлектуальнасць чалавека. А хіба нельга ўзбагаціцца духоўна, атрымаць асалоду, мадэліруючы самалёт ці вывучаючы нейкі механізм? Па-мойму, тут таксама нямала прастору для думак, развагі. І калі чалавек знаходзіць задавальненне ў гэтым, дык ці варта яго цягнуць у кіно: маўляў, ідзі, а то будзеш адсталым чалавекам. Прабачце, скажа ён, а вы сядайце за стол і дабудуйце мне мадэль. Выяўляецца, што ў гэтай справе вам нічога «не свеціць», бо пазнанняў у галіне мастацкай літаратуры тут мала.

Аўтара здзівіла тое, што студэнты матфака, ФПМ не чыталі Экзюперы, Хемінгуэя. А ці адчуваў бы сябе так упэўнена прадстаўнік гуманітарнага факультэта, калі б яго пачалі распытваць пра навейшыя праблемы фізікі, хіміі, пра вучоных у гэтых галінах навукі? Напэўна, не.

Дык чаму ж мы здзіўляемся, што матэматык не чытаў, як нам здаецца, цікавую кніжку сучаснага аўтара, і лічым зусім звычайным, калі філолаг не прыпамінае, хто вывеў тую ці іншую формулу? Правы ж у іх аднолькавыя. Значыць, горшае веданне аднаго кампенсуецца за кошт лепшага ведання другога. І ў выніку культурныя ўзроўні атрымліваюцца ідэнтычнымі. Ці прыходзіцца пасля гэтага папракаць студэнтаў тэхнічных факультэтаў, што яны горш ведаюць літаратуру, менш бываюць у кіно? Яны знаходзяць тую паэзію, аб якой правільна гаварыў Паустоўскі, у матэматычных формулах, у чарцяжах, г. зн. у тым, што ім па душы. І гэтым самым «узбагачаюць сваё жыццё, расшыраюць сваё разуменне свету, робяць для сябе шмат цікавых і прыемных адкрыццяў». А паглядзець кіно або прачытаць цікавую кнігу яны таксама не адмовяцца, калі гэта здасца ім патрэбным.

Вось такая мая думка, дарэчы, студэнта гуманітарнага факультэта, наконт данай праблемы.

**У. КУБІНАЎ.**

# СТАРОНКА БРАТЭРСКІХ СУВЯЗЕЙ

Ва ўмацаванне і далейшае развіццё беларуска-украінскіх літаратурных сувязей свой уклад уносіць і наш універсітэт, перш за ўсё — і гэта зусім зразумела — філалагічны факультэт. Некаторыя выкладчыкі — Язэп Семяжон, Алег Лойка, Ніл Гілевіч, Рыгор Семашкевіч і іншыя актыўна перакладаюць украінскую літаратуру на беларускую мову. Асобныя вучоныя (С. А. Лысенка, П. І. Ткачоў і іншыя) даследуюць творчасць украінскіх пісьменнікаў. На факультэце штогод абараняюцца курсавыя і дыпломныя работы, напісаныя на матэрыяле дарэвалюцыйнай і савецкай украінскай літаратуры, вядзецца семінар па беларуска-украінскіх літаратурных сувязях (кіраўнік — дацэнт К. Р. Хромчанка).

Асабліва важкі ўклад нашых вучоных у распрацоўцы тэорыі і гісторыі сувязей дзвюх літаратур. Як вядома, на Беларусі і Украіне рэгулярна праводзяцца спецыяльныя навуковыя канферэнцыі па вывучэнню беларуска-украінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. Першая такая канферэнцыя адбылася ў Гомелі ў 1969 годзе, другая, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР, —у Львове ў 1972 годзе. Як на першай, так і на другой канферэнцыях выступалі прадстаўнікі нашага універсітэта. У прыватнасці, на канферэнцыі ў Львове з 25 дакладаў тры былі зроблены вучонымі філфака БДУ, у тым ліку прафесарам А. А. Лойкам («Маладая беларуская і украінская паэзія 60-х гг.»), дацэнтамі К. Р. Хромчанкам («Беларуска-украінскія літаратурныя сувязі 20-х гг».) і В. П. Рагойшам) «М. Танк у перакладах на ўкраінскую мову»).

Няўхільна расшыраецца украіназнаўчая тэматыка і на навуковых канферэнцыях факультэта. Так, калі на першай славістычнай канферэнцыі ў 1968 годзе па украінскай літаратуры і беларуска-украінскіх літаратурных сувязях было заслухана 8 дакладаў і паведамленняў, то на другой (май 1973 года)— 17. Рост відавочны.

На філфаку даволі часта праходзяць вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці выдатных украінскіх літаратараў, адбываюцца сустрэчы з украінскімі пісьменнікамі. У 1972 годзе, напрыклад, філолагі прымалі вядомых украінскіх літаратараў, перакладчыкаў беларускай літаратуры М. Нагнібяду, А. Юшчанку, М. Упеніка, М. Сынгаеўскага, Б. Сцепанюка. А ў мінулую пятніцу да іх у госці прыйшлі Мікола Алейнік, дзве аповесці якога — «Леся» і «Утрапёная» — выйшлі асобнымі выданнямі на беларускай мове, львоўскі літаратар Мікола Раманчанка, які ў Вялікую Айчынную вайну вызваляў Мінск, і ужгарадскі паэт Васіль Ваўчок. Вёў вечар Аляксей Кулакоўскі. З дакладам пра беларуска-украінскія літаратурныя сувязі выступіў дацэнт В. П. Рагойша. Зала цёпла сустрэла выступленні украінскіх літаратараў. Беларускія пісьменнікі, якія таксама прыйшлі ў госці да студэнтаў — Алесь Бачыла, Язэп Семяжон, Рыгор Барадулін, Васіль Зуёнак, Іван Чыгрынаў, Рыгор Семашкевіч, — прачыталі свае новыя творы і пераклады украінскай паэзіі, падзяліліся творчымі планамі. Вечар з'явіўся яркім адлюстраваннем таварыскасці, дружбы, брацтва, якія робяць магутным і непарушным наш Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

**В. КАЧАНОВІЧ.**



**НА ЗДЫМКУ:** у час вечара беларуска-украінскай літаратуры.

Фота **Д. Чаховіча.**

## УСЛЕД ЗА ПАДАРОЖНІКАМ

На днях на геаграфічным факультэце адбылося пасяджэнне аддзялення фізічнай геаграфіі геаграфічнага таварыства БССР. Уражаннямі аб турысцкай паездцы па Заходняй Афрыцы падзяліўся кандыдат эканамічных навук В. А. Каган, які наведаў Сенегал, Марока, Канарскія астравы і Іспанію.

Ён расказаў аб прыродных асаблівасцях, рысах культуры, быту афрыканскіх народаў. Ужо пачатак падарожжа — паветраны пералёт з зімовай Масквы ў Дакар, дзе панавала лета з тэмпературай +28 градусаў,— уразіў турыстаў. Асабліва запомніўся начны горад, які не спаў. Працавалі магазіны, прыватныя крамы, бары, рэстараны. Самымі прывабнымі для падарожнікаў аказаліся сувенірныя крамы. І калі пакупнік засяроджваў свой погляд на якой-небудзь рэчы, то яна імгненна аказвалася ў яго руках, і вярнуць яе гаспадару было проста немагчыма.

Дакар на працягу многіх вякоў быў цэнтрам гандлю рабамі. Цяпер пра тыя жорсткія часы пакут і гора напамінае спецыяльна створаны музей.

Касабланка — горад кантрастаў... Іспанія, якую штогод наведваюць больш 30 мільёнаў турыстаў. Цікавыя факты, лічбы, падзеі...

З вялікай увагай праслухалі гэты расказ выкладчыкі і студэнты. І хоць падарожжа было завочным, яно пакінула незабыўнае ўражанне.

**В. ІОСЬКА, В. КАРАЛЕВІЧ.**

**У 1974 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйдзе двухтомная анталогія украінскай савецкай паэзіі на беларускай мове. Творы для гэтай анталогіі перакладалі і некаторыя выкладчыкі нашага універсітэта. Ніжэй мы змяшчаем два вершы украінскіх паэтаў В. Сіманенкі і Р. Траццякова ў перакладах В. Рагойшы, якія ўвойдуць у другі том анталогіі.**

*Васіль СІМАНЕНКА*

## ЛЕБЕДЗІ МАЦЯРЫНСТВА

Мрояць крыламі з туману лебедзі ружозыя,
Сыплюць ночы ў лімань зоры сургучовыя.
Заглядае ў шыбы казка сівымі вачыма,
Зноўку матчыная ласка ў яе за плячыма.
Ой бяжы, бяжы, мой жалю, не хадзі тут бліэка,
Каб гайдаў ты—не жадаю—сынаву калыску.
Прыплывіце да калыскі, мае лебядзенькі,
Зоры ціхія, спадзіце сынулю пад вейкі.
Пеўні растрывожылі цемру ў сяле,
Танцавалі лебедзі ў хаце на сцяне,
Лапаталі крыламі і ружовым пёр'ем,
Ласкаталі марыва залатым сузор'ям.
Вырасцеш ты, сыне, ляжа шлях пад ногі,
Вырастуць з табою новыя трывогі.
На змярканні хмельным маўка-чарнаброўка
Будзе ждаць любові, ласкавага слоўка.
Будуць цябе клікаць у сады зялёныя
Хлопцаў чарначубых дзіва-нарачоныя.
Можаш выбіраць ты жонку і сябрыну,
Толькі нельга, сыне, выбіраць Айчыну.
Можна выбраць сябра, калі раптам страціў,
Толькі нельга, сыне, маці выбіраці.
У вандроўкі рушаць за табою, сынку,
Вочы мацярынскія, белая хацінка.
І калі ўпадзеш ты на чужацкім полі,
Прыйдуць з Украіны вербы і таполі,
Схіляцца журботна, лісцем залапочуць,
Сумам развітання душу заласкочуць.
Можна ўсё на свеце выбраць лепшым чынам,
Толькі нельга, сыне, выбіраць Айчыну.

*Роберт ТРАЦЦЯКОЎ*

* * *

*У свет я прагну.*
*Прагну ў акіяны.*
*Хачу я кожным мускулам адчуць*
*Напружанне зямных мерыдыянаў —*
*Іх кантыненты збуджаныя рвуць.*
*Пабыць, дзе мір і дзе вайны пажары,*
*Сталіцамі і портамі прайсці*
*І ўзяць з палітры кожнага паўшар'я*
*Гарачых фарбаў для сваіх карцін —*
*Пурпур ангольскі і Сахары вохру,*
*Кармін кубінскіх вогненных сцягоў...*
*І быць заўжды дакладным, як географ.*
*І ленінцам у выбары таноў!*

*Пераклаў В. РАГОЙША.*

ЛІСТОК ДАІ

## УВАГА: СВЕТАФОР!

Напэўна, сёння ўсім зразумела, што вуліцу трэба пераходзіць умела і ўважліва. Інтэнсіўнасць транспартнага руху ўзрасла настолькі, што без ведання правіл руху вуліцу перайсці цяжка. Аднак не кожны пешаход прытрымліваецца гэтых правіл. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Паназірайце за пешаходамі на любым скрыжаванні. Многія не звяртаюць увагі на забараняючы сігнал светафора, перабягаюць вуліцу, падвяргаючы небяспецы сваё жыццё і жыццё вадзіцеляў. За 9 месяцаў у сталіцы адбылося 479 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх загінула 42 пешаходы і 469 паранена.

Нягледзячы на тое, што усюды вядзецца шырокая прапаганда правіл дарожнага руху, усё яшчэ шмат пешаходаў, якія парушаюць іх. Так, 15 кастрычніка на скрыжаванні Ленінскага праспекта і вуліцы Валадарскага трапіў пад аўтобус мужчына, які пераходзіў вуліцу на забараняючы сігнал светафора. Ён памёр на месцы дарожна-транспартнага здарэння. Таксама не звярнуў увагі на сігналы светафора рабочы маторнага завода П. Ф. Ціткоў. На скрыжаванні вуліцы Жданава і Партызанскага праспекта ён пераходзіў вуліцу на чырвоны сігнал і быў збіт аўтобусам. У выніку атрымаў цяжкую траўму. Падобных здарэнняў шмат.

Больш ста студэнтаў універсітэта было аштрафавана за парушэнне правіл руху.

Цяпер цяжкі для транспарту час: снег, галалёдзіца зніжаюць кіруемасць транспарту, у шмат разоў павялічваецца тармазны шлях. І таму кожнаму трэба прытрымлівацца законаў дарог, берагчы сваё жыццё і здароўе і не падаваць дрэннага прыкладу іншым.

**П. ДУБОЎСКІ, інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома, капітан міліцыі.**

## ЦУДОЎНЕЙ ДАРОГІ НІЧОГА НА СВЕЦЕ НЯМА

Прасторная 58-я аўдыторыя геафака паступова запаўняецца студэнтамі. На сцэне сімвал сённяшняга вечара: хлопец і дзяўчына, узяўшыся за рукі, ідуць па глобусу ў сінюю далячынь. Вечар так і называецца—«Блакітныя дарогі». Ён прысвечан Міжнароднаму дню студэнтаў.

Удзельнікаў канцэрта адразу пазнаеш: хлопцаў — па блакітных гальштуках, дзяўчат—па такіх жа хусцінках.

Праграма канцэрта, як заўсёды, цікавая і разнастайная. Тут песні «Блакітныя дарогі», «Край бярозавы», «Тэадаліт», якую склалі самі студэнты. Кожны нумар цёпла сустракаецца аўдыторыяй. З задавальненнем глядзелі прысутныя «Іспанскі» і «Матроскі» танцы ў выкананні членаў танцавальнага калектыву.

«Бестурботны» студэнцкі народ паказаў сцэнкі са свайго жыцця. Кожная мініяцюра суправаджалася бурнымі апладысментамі і смехам — многія пазналі сябе.

І доўга яшчэ ў аўдыторыі будуць гучаць музыка, задорны смех, жарты. Сёння свята ў самай неспакойнай паловы чалавецтва.

**Н. НОВІКАВА.**



**НА ЗДЫМКУ:** спяваюць Тамара ТАЧОНАЯ і Таццяна ГЛАЗНОВА.

Фота **Н. Шчынскай.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Па запрашэнню мясцкома і спартыўнага клуба Гомельскага дзяржаўнага універсітэта ў Гомель для правядзення таварыскай сустрэчы па футболу ўпершыню выязджала зборная каманда супрацоўнікаў БДУ.

Мы зрабілі экскурсію па гораду, пазнаёміліся з фізічным і спартыўным факультэтамі ГДУ. А затым каманды выйшлі на поле. Гульня прайшла з перавагай каманды нашага універсітэта. Ракавымі для гаспадароў поля з'явіліся саракавыя мінуты першага і другога таймаў. Спачатку А. Клішчанка (фізфак), які меў да гэтага дзве стопрацэнтныя магчымасці забіць гол, прабіў не моцна, але дакладна ў левы ад варатара вугал. За пяць мінут да канца гульні А. Харэвіч (кафедра фізвыхавання) прайшоў па цэнтру і замацаваў поспех сваёй каманды.

Сустрэчы на ўзроўні зборных каманд супрацоўнікаў вырашана зрабіць традыцыйнымі.

**І. МАНАК.**

## ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ

Закончыліся занальныя першынствы вну БССР па валейболу і баскетболу.

Жаночая валейбольная каманда БДУ ўпэўнена правяла ўсе сустрэчы, не прайграўшы ніводнай.

У баскетбалістак першынство праходзіла ў Магілёве. Каманда універсітэта пацярпела ўсяго адно паражэнне ад баскетбалістак Мінскага педагагічнага інстытута і заняла другое месца.

Мужчынская каманда БДУ па валейболу, прайграўшы апошнюю сустрэчу з камандай політэхнічнага інстытута, перамясцілася з першага на другое месца.

Такім чынам, усе каманды універсітэта атрымалі права ўдзельнічаць у фінальных першынствах вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якія будуць праходзіць вясной будучага года.

**Н. МАЗАЛЯКА, студэнтка журфака.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз. Аб'ём — 1 друк ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 21027 Зак. 1385.